

# Кафедра бібліяграфіі і дакументазнаўства насустрач юбілею ФБС

У кастрычніку 2000 г. факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта будзе святкаваць сваё 55-годдзе. Спецыяльная кафедра бібліяграфіі і дакументазнаўства, якая працуе у складзе факультэта як самастойнае структурнае падраздзяленне, была створана у 1960 г., хоць выкладанне бібліяграфічных дысцыплін на факультэце ажыццяўлялася з пачатку яго арганізацыі. Заснавальнік кафедры — вядомы бібліёграф і бібліяграфазнаўца, дацэнт М.Ц.Талкачоў, які узначальваў яе на працягу 14 гадоў (да верасня 1973 г.). У розныя часы загадчыкамі кафедры працавалі М.І.Савачкіна, дацэнт, канд. педагагічных навук В.А.Факееў. Якасць падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчнай справы ў значнай ступені залежыць ад узроўню навукова-даследчай работы выкладчыкаў і укаранення яе вынікаў у навучальны працэс. Навуковы цэнз выкладчыкаў кафедры за апошнія 20 гадоў значна павысіўся. У яе складзе працуюць адзін прафесар, доктар навук, дзевяць дацэнтаў, кандыдатаў навук, два старшыя выкладчыкі і адзін выкладчык.

Выкладчыкамі кафедры упершыню напісаны і выдадзены падручнік "Беларуская бібліяграфія. Агульны курс" (аўтар В.Е.Лявончыкаў), вучэбны дапаможнік "Галіновыя бібліяграфіі Беларусі" (аўтары Л.Р.Амяльковіч, М.В.Іваноў, І.У.Мельнік, Р.А.Ровіна, М.І.Савачкіна, Т.М.Сакалова, В.А.Факееў, Н.М.Цацуліна), "Руска-беларускі слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў" (аўтары В.Е.Лявончыкаў і Л.А.Дзямешка). У студзені 2000 г. у выдавецтве Беларускага універсітэта культуры упершыню выйдзе "Тлумачальны слоўнік бібліятэчна-бібліяграфічных тэрмінаў" (аўтары В.Е.Лявончыкаў, Л.А.Дзямешка, Р.І.Саматыя). Дацэнты С.В.Зыгмантовіч, В.А.Касап, Р.А.Ровіна, В.І.Саітава пішуць вучэбныя дапаможнікі па арганізацыі і тэхналогіі бібліяграфічнай работы бібліятэк, інфармацыйна-бібліяграфічнаму забеспячэнню прыродазнаўства, тэхнікі і сельскай гаспадаркі, гісторыі сусветнай бібліяграфіі.

Кафедра клапоціцца аб падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. Да кафедры прымацавана 4 суіскальнікі, якія працуюць над кандыдацкімі дысертацыямі і 2 аспіранты. Толькі з 1996 па 1999 гг. на кафедры абаранілі кандыдацкія дысертацыі грамадзянін Сірыі Ібрагім Бадархан ("Гісторыя і сучасны стан нацыянальнай бібліяграфіі Сірыі ў святле канцэпцыі міжнароднай праграмы УПУ/МАРК"), Т.В.Кузьмініч ("Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі па гісторыі Беларусі"), І.У.Дрыга ("Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтву у Рэспубліцы Беларусь"). Завяршыла дысертацыйнае даследаванне А.В.Прадзеіна па тэме "Краязнаўчая бібліяграфічная дзейнасць абласных універсальных навуковых бібліятэк Рэспублікі Беларусь", якое рэкамендавана да абароны.

Ператварэнне інстытута культуры ва універсітэт патрабавалі ад выкладчыкаў не толькі ўдасканальвання сістэмы адукацыі, а прынцыповай змены яе тэхналогіі і зместу. Таму па усіх дакуменазнаўча-інфармацыйных і бібліяграфічных дысцыплінах былі распрацаваны новыя праграмы з улікам апошніх навуковых дасягненняў і новых інфармацыйных тэхналогіі. На факультэце дзейнічае шматузроўневае навучанне. Побач з падрыхтоўкай бібліятэкараў-бібліёграфаў для практычнай дзейнасці рыхтуюцца бакалаўры і магістры па гуманітарных навуках. Апошнія пасля паспяховай абароны магістарскіх дысертацый, могуць выкладаць на факультэце ці весці навукова-даследчую работу у буйнейшых бібліятэках рэспублікі.

Па ініцыятыве кафедры на ФБІС было распачата навучанне студэнтаў па спецыялізацыях "Навукова-тэхнічныя і спецыяльныя бібліятэкі", Кнігазнаўства і кніжны гандаль", "Бібліятэказнаўства і краязнаўства", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія рукапіснай і рэдкай кнігі". У апошнія гады выкладчыкі распрацавалі і чытаюць такія новыя курсы, як "Інфармацыйная культура асобы", "Арганізацыя і методыка навукова-даследчай дзейнасці", "Патэнтна-інфармацыйная дзейнасць", "Стварэнне фірменнай інфармацыі," "Рэдагаванне інфармацыйнай прадукцыі" (у аўтаматызаваным рэжыме) і іншыя.

*В.Е.Лявончыкаў*